Пад "унутранай" мемуарыстыкай трэба разумець жыццядзейнасць і творчасць тых пісьменнікаў, што вымушаны былі працаваць пад пільным наглядам савецкай цэнзуры. Гэта такія творцы, як Л.Геніюш. Яе "Споведзь" прымушае балюча сціснуцца сэрца кожнага, хто пазнаёміцца са старонкамі гэтага твора. Цікавая для нас творчасць Аляхновіча, якому асабіста, як і многім іншым, давялося адчуць "клопат" савецкіх улад пра сябе. Аб гэтым ён расказаў у жудасным па сваёй праўдзівасці мемуарным творы пад назвай "У кіпцюрах ГПУ". Не менш драматычны лёс у С.Грахоўскага, аўтара твораў "З воўчым білетам", "Такія сінія касачы". "Жыццёвыя клопаты" І.Мележа, "Дзённік" К.Чорнага і многія іншыя творы могуць увайсці ў праграму названага спецкурса.

"Знешняя" мемуарыстыка - гэта творчасць тых нашых суайчыннікаў, што воляй лёсу былі адарваны ад сваёй Бацькаўшчыны і вымушаны былі працаваць далёка па-за яе межамі. Дзякуючы гэтаму мы маем магчымасць пазнаёміцца з мемуарыстыкай, што ўзнікла і развівалася ў непадлеглых жорсткай цэнзуры ўмовах, а значыць,гэта творчасць была больш вольнай, незалежнай і, відаць, больш аб'ектыўнай. Прыкладам такой мемуарыстыкі з'яўляецца творчасць Яна Пятроўскага, асобы, пра якую яшчэ невядома шырокаму колу чытачоў. Між тым Ян Пятроўскі - аўтар двухтомніка мемуараў, што маюць падзагаловак "Стагоддзе ў рэтраспекцыі", выдадзеных у ЗША: першы том - у 1988 годзе, другі - у 1991 годзе. Сёлета чакаецца выхад трэцяга тома.

Нельга абысці ўвагай і творчасць С.Хмары-Сіняка, В.Яцэвіч, П.Міарановіча і многіх іншых.

У час правядзення спецкурса па беларускай літаратуры належнае месца павінна адводзіцца і навуковай працы студэнтаў, бо самастойныя даследаванні, творчы пошук пад кіраўніцтвам выкладчыка спрыяюць фарміраванню высокадухоўнай, высокаінтэлектуальнай і гарманічна развітой асобы.

Спецкурс па беларускай літаратуры -- адна з форм далучэння моладзі да духоўнай скарбніцы народа, да яго гістарычнага мінулага і да праблематычнага сучаснага.

Булацкая Н.А.,
канд.філал.навук,
дацэнт

## БЕСПЕРАПЫННАЯ ЛІТАРАТУРНАЯ АДУКАЦЫЯ: НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ТЭМЫ

Не выклікае, напэўна, спрэчак сцвярджэнне аб тым, што літаратурная адукацыя пачынаецца з першых казак, песень, якія чуем у дзяцінстве. Школа з'яўляецца наступным этапам. У залежнасці ад якасці ведаў, эрудыцыі, духоўнага свету таго, хто павядзе, залежыць колькасць тых, хто зацікавіцца літаратурай. Існуе яшчэ шэраг прычын, якія аказваюць уплыў на ўзровень літаратурнай і духоўнай культуры. Не сакрэт, што для пэўнай часткі чытачоў на гэтым літаратурная адукацыя і скончыцца, і ў далейшым для іх кніга стане заняткам, на жаль, забаўляльным, для правядзення часу. На такі ўзровень чытача разлічваюць сучасныя дзялкі ад кнігі, якія прапануюць нізкаякаснае "чціва", захапіўшае прылаўкі. Ёсць пэўная колькасць студэнтаў, якія трапілі ў ВНУ з такім ўзроўнем "адукацыі", і працаваць з імі цяжка, але неабходна. Дыферэнцыяцыя студэнтаў па сацыяльна-псіхалагічных тыпах, такім чынам, становіцца для выкладчыка ВНУ адной з умоў работы. Давесці іх да сярэдняга ўзроўню літаратурнай адукацыі - складаны і не хуткі працэс. Неабходна пры гэтым звярнуць увагу на змены інтэлектуальнага, псіхалагічнага і ўзроставага парадку.

Для іншых літаратурная адукацыя працягваецца. Гэта тыя, хто чытае не проста так, а аналізуе, пазнае механізм уздзеяння мастацкага твора, вобраза і г.д. Іх цікавяць "праблемы" і, у першую чаргу, "нявырашаныя", у іх ёсць эстэтычныя патрэбы, прафесійная зацікаўленасць. Але ў падобнай аўдыторыі трэба вызначыць ступень набытых навыкаў, магчымасцяў. Гэту аўдыторыю цікавяць лекцыі праблемнага характару, спецкурсы і спецсемінары, якія пашыраюць гарызонты імёнаў і твораў, даюць магчымасць абагульнення, удакладнення ведаў і ўзнікшых пытанняў. Сутыкненне з пісьменнікам на гэтым узроўні адбываецца не па прынцыпу "згодзен - не згодзен", а "ў чым не згодзен". Дыскусія, навуковая работа, літаратурны, "свой" твор вызначаюць паводзіны, выхоўваюць павагу



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да суразмоўцы, выпрацоўваюць навыкі культурнай дыскусіі і адначасова далучаюць да гутаркі астатніх, якія пакуль што абапіраюцца на "жыццёвы", а не "літаратурны" вопыт.

Літаратуру ствараюць не толькі геніі. У ВНУ павінна адбыцца размова (якой не было ні ў школе, ні ў вучылішчы) пра пісьменнікаў другога, трэцяга парадку. Вызначэнне месца такога аўтара ці твора ў літаратурным працэсе з улікам агульнага фону, гісторыі развіцця літаратуры далучае студэнта да літаратурнага працэсу, робіць яго ўдзельнікам і, як вынік, ускладае на яго пэўную адказнасць. Адначасова падобная работа выхоўвае літаратурны густ.

Трэба весці размову аб зваротнай сувязі "літаратура - жыццё", аб наследаванні літаратуры як у добрым, так і дрэнным сэнсе. Напрыклад, "Страдания юного Вертера" Гётэ і хваля юнацкіх самагубстваў, героі а-ля Марлінскі - лейтэнант Белазор, тургенеўскія жанчыны і сучасная Эмануэль.

Асобна трэба вылучыць пытанне "літаратура, свет асобы і духоўная культура чалавецтва". Эмацыянальныя адносіны мастака слова да жыцця звязаны з яго перакананнямі, грамадзянскімі і маральнымі ідэаламі, зыходзячы з якіх ён ацэньвае рэчаіснасць. Нездарма і Г.Лесінг, і Д.Дзідро, і М.Чарнышэўскі назвалі яго суддзёй, г.зн. асобай патрабавальнай, шчырай, адказнай, якая дапамагае зрабіць маральнае самавызначэнне. Студэнт як чытач становіцца саўдзельнікам працэсу, далучаецца да яго. Перад ім паўстаюць пытанні аб ролі мастацтва, літаратуры ў працэсе павышэння маральнага тонусу эстэтычных норм, духоўнай энергіі грамадства. Літаратура ўплывае на асобу не адразу. Прафесіяналізм выкладчыка дапаможа знайсці вытокі і карані, звесці, выправіць арыентацыі, папярэдзіць тэндэнцыйнасць і безапеляцыйнасць у меркаваннях.

Не шляхам палярнасці "чаму навучылі - перавучылі" трэба ісці. Сінтэз літаратурнай адукацыі ў ВНУ, інтэграцыя - вось які павінен быць шлях. Літаратурная адукацыя не павінна спыніцца на першым ці другім курсе. Праблемы, вызначаныя літаратурай, не вырашаны, а добра пастаўлены. Мастацкі матэрыял патрабуе далейшага аналізу. Многія аспекты і моманты літаратурнага развіцця і культуры патрабуюць вызначыць падыходы да сучаснага жыццёвага і творчага працэсаў. І трэба памятаць, што літаратура, мастацтва "трэніруюць", па словах Лесінга, маральныя пачуцці чалавека, пашыраюць вопыт жыццёвы і эмацыянальны, абуджаюць душу, а гэта значыць, і шліфуюць прафесійнае мастацтва.

Садаўнічы Э.В.,
канд.філал.навук,
дацэнт
Суддзева Н.Л.,
канд.філал.навук,
дацэнт

## ВЫВУЧЭННЕ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ЛІТАРАТУРЫ ЯК НЕАДЪЕМНАЙ ЧАСТКІ СУСВЕТНАГА ЛІТАРАТУРНАГА ПРАЦЭСУ

Доўгі час гісторыя беларускай літаратуры вывучалася ў адасабленні ад сусветнага літаратурнага працэсу (М.Лазарук). Раскрыццё яе сувязей з сусветным мастацтвам слова, як гэта цяпер яскрава відаць, насіла даволі павярхоўны характар, было фармальным, нечым дадатковым, пабочным. Аб гэтым сведчыць вылучэнне ў літаратуразнаўстве асобнай галіны, маючай на мэце даследаванне "ўзаемасувязяў і ўзаемаўплываў літаратур".

Узорам для навукі ўсіх рэспублік былога Саюза служыла рускае афіцыйнае літаратуразнаўства савецкага перыяду. Асноўны прынцып яго быў прыблізна такі. Возьмем для прыкладу рускую літаратуру Х1Х ст. У заходнееўрапейскіх літаратурах на гэты час дамінуючымі творчымі метадамі з'яўляліся рамантызм і рэалізм. Адсюль у рускай: вось тое - рамантызм, а гэта - рэалізм.

Цяпер у рускім літаратуразнаўстве выказваецца меркаванне, што творчасць Пушкіна мае асветніцкі характар. І сапраўды, яго Анегін блізкі пэўным персанажам-дваранам Філдынга і Бамаршэ. "Лішнія людзі" ў рускай літаратуры спалучаюць у сабе рысы гётэўскага Вертэра і байранаўскіх рамантычных герояў. Супрацьстаянне памешчыкаў і Чычыкава ў "Мёртвых душах" Гогаля роднаснае супрацьпастаўленню дваранскіх вярхоў і трэцяга саслоўя ў еўрапейскай асветніцкай літаратуры ХУШ ст., і ў той жа час на прынцыпах стварэння характараў пісьменнік блізкі Бальзаку. Ганчароўскі Абломаў нагадвае двараніна з "Жака-фаталіста"

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ